Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

1 верасня 2011 года, № 14 (2052)

## Чытайце ў нумары:

**ПЕРСПЕКТЫВЫ АБНАДЗЕЙВАЮЦЬ**

Гутарка з дырэктарам Студгарадка БДУ Міхаілам ЧАРАПЕННІКАВЫМ пра студэнцкія клопаты і планы кіраўніцтва

Стар. 2

**А ШТО ВЫ МОЖАЦЕ НАМ ДАЦЬ?**

У першыя дні верасня ў новых студэнцкіх групах выбіраюць прафгрупаргаў, якія будуць займацца сацыяльнымі пытаннямі. А студэнты змогуць з'ездзіць на экскурсіі, наведацца ў тэатры, музеі і цікава адпачыць

Стар. 3

**ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА**

Гід для новых студэнтаў па моладзевых арганізацыях альма-матар, творчых калектывах, а таксама рэсурсах Фундаментальнай бібліятэкі

Стар. 4

**НА ЎКЛАДЫШЫ ГАЗЕТЫ**

чытайце цікавосткі ад Псіхалагічнай службы БДУ

# З Днём ведаў

*Шаноўныя студэнты і супрацоўнікі!*



Шчыра віншую ўсіх з пачаткам новага навучальнага года! Для Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ён знамянальны. У кастрычніку мы адзначым 90-годдзе альма-матар! Універсітэцкае супольніцтва загадзя рыхтавалася да гэтай значнай падзеі. Цягам мінулага года прайшло **шмат мерапрыемстваў пад знакам юбілею ўніверсітэта**, сярод іх вылучаюцца шырокая прэс-канферэнцыя да пачатку прыёмнай кампаніі, маштабны фестываль факультэтаў, а таксама медыйны праект «Паступаем у БДУ!».

Прыемна, што нашы намаганні ў дачыненні абітурыентаў прынеслі плён. Нягледзячы на істотнае змяншэнне колькасці выпускнікоў школ у сувязі з дэмаграфічнай сітуацыяй, **прыёмная кампанія–2011 стала самай выніковай за ўсю гісторыю ВНУ**. На ўсе формы навучання залічана найвялікшая колькасць абітурыентаў – 6386 (у 2010 г. – 6218), у тым ліку на дзённы бюджэт – 2094 (у 2010 г. – 2093); дзённую платную – 2191 (у 2010 г. – 2134).

На дзённую бюджэтную форму паступілі 120 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў, а таксама 448 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакамі каледжаў і тэхнікумаў (21,4 % ад залічаных); 996 выпускнікоў ліцэяў і гімназій (47,6 %). **План прыёму выкананы па ўсіх спецыяльнасцях.** Характэрна, што істотна зменшылася колькасць мінчан: іх зараз толькі 35,6 % (у 2010 г. 36,7 %), што адпавядае статусу БДУ як агульнанацыянальнага ўніверсітэта.

**Сёлетні набор стаў не толькі самым вялікім, але і адным з самых якасных!** Сярод студэнтаў, залічаных па агульным конкурсе, 819 набралі 300 балаў і вышэй, што склала 41,6 %. Адпаведна павысіліся і прахадныя балы.

Гэта сведчыць пра высокі ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў першага курса і дае нам падставу з надзеяй зазіраць у будучыню! Здольныя студэнты сваімі поспехамі яшчэ больш паспрыяюць умацаванню міжнароднага аўтарытэту БДУ. За апошнія паўгода **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт узняўся ў сусветным рэйтынгу на высокую 1208-ю пазіцыю** (з 1474-й). Я ўпэўнены, што не за гарамі ўваход і ў першую тысячу з больш як 13 тыс. ВНУ, якія ацэньвае Webometrics.

Акрамя таго, важнай падзеяй, асабліва для студэнтаў, неўзабаве стане ўвядзенне ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту інтэрната № 7 і завяршэнне будаўніцтва новага навучальнага корпуса БДУ на Прывакзальнай плошчы.

У межах святкавання юбілею ўніверсітэта пройдуць тыдзень моладзевай навукі ў БДУ і буйная канферэнцыя «Універсітэт, грамадства, інавацыйнае развіццё», адбудзецца адкрыццё мемарыяльных дошак нашым слынным рэктарам У. Пічэту і А. Сеўчанку і ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, міністэрстваў і ведамстваў, VIP-гасцей. У шэрагу забаўляльных мерапрыемстваў мега-dance-шоу «Нам – 90», канцэрт у Белдзяржфілармоніі, а таксама канцэрт самадзейных калектываў БДУ ў Палацы спорту.

Спадзяюся, што падчас урачыстасцяў кожны з нас зможа адчуць вялікі гонар за альма-матар і атрымае добры імпульс для творчай працы.

Здароўя вам усім і дабрабыту!

Слава табе, БДУ!

***Рэктар акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА***

# ВІВАТ, СТУДЭНТ!

***Па традыцыі БДУ 1 верасня прысвячае ўсіх залічаных абітурыентаў у студэнты.***

**Святкаванне распачнецца ў 11.00** перад будынкам рэктарата на ўрачыстай сустрэчы рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі са студэнцкім актывам 1 курса. Прагучыць гімн БДУ ў выкананні вакальнай групы «Галант». Пасля першакурснікі змогуць пабываць у кабінеце рэктара і сфатаграфавацца.

**У 12.00** у Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы пачнецца набажэнства ў гонар пачатку новага навучальнага года ў БДУ.

**У 17.30 у Палацы спорту** зладзіцца тэатралізаваная шоу-праграма «Віват, студэнт БДУ!» з удзелам творчых калектываў універсітэта і ўдзельнікаў Фестывалю эстрады БДУ. Увагу прыцягне ўрачысты парад факультэтаў з шэсцем дэканаў і ўнясеннем штандара альма-матар, а таксама клятва першакурснікаў і ўручэнне сімвалічнага студэнцкага білета. Працягнуць святкаванне зоркі беларускай эстрады і дыскапраграма з конкурсамі і прызамі.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па справах культуры**



Фота Аляксандра СНАПКА

## Весткі з рэктарата

ДАЛЕЙШАМУ ўмацаванню партнёрскіх адносін БДУ з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Гродна быў прысвечаны візіт нашай дэлегацыі на чале з рэктарам акадэмікам Сяргеем Абламейкам.

12 жніўня прайшло сумеснае пасяджэнне рэктаратаў БДУ і ГрДУ імя Янкі Купалы. Былі падведзены вынікі супрацоўніцтва дзвюх ВНУ і абмеркаваны планы.

Падобнае мерапрыемства адбылося і ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Тут Сяргей Абламейка са сваім калегам Віктарам Сняжыцкім падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, навукі і інавацыйнай дзейнасці. Прадугледжваецца, акрамя іншага, кааперацыя для павышэння якасці падрыхтоўкі кадраў у галіне гуманітарных навук, філалогіі, замежных моў, фізікі і хіміі.

* * *

РЭКТАР БДУ акадэмік Сяргей Абламейка сустрэўся 11 жніўня з віцэ-дырэктарам Інстытута рускай мовы Універсітэта Каро (Сеул, Рэспубліка Карэя) прафесарам Кім Джын Кю. Абмяркоўвалася практычная рэалізацыя мемарандума аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Універсітэтам Каро, які ўваходзіць у першую сотню ў свеце. Бакі дамовіліся пра абмен студэнтамі і супрацоўнікамі па спецыяльнасцях «руская філалогія» і «карэйская філалогія». Дарэчы, БДУ – адзіная навучальная ўстанова ў нашай краіне, дзе вывучаецца карэйская мова. На факультэце міжнародных адносін існуе спецыяльнасць «лінгвакраіназнаўства», тут жа ў 2009 г. быў створаны цэнтр карэязнаўства.

* * *

СУСТРЭЧА рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі з міністрам па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Вашчанкам адбылася 5 жніўня. Абмеркаваны магчымыя перспектывы супрацоўніцтва ў галіне навукова-тэхнічнай дзейнасці. Госць азнаёміўся з новымі распрацоўкамі ВНУ, якія могуць быць выкарыстаны пры папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

Да 90-годдзя БДУ!

## *Міхаіл Чарапеннікаў:*

# ПЕРСПЕКТЫВЫ АБНАДЗЕЙВАЮЦЬ

***Звычайна канец жніўня – гарачая пара. Але для студэнцкага гарадка гэты перыяд удвая больш «падпечаны» з-за засялення студэнтаў у інтэрнаты. З пэўнага часу працэс гэты стаў даволі напружаным, але ў той жа час і больш простым. Пра гэты парадокс, а таксама пра іншыя аспекты жыццябыцця студэнтаў мы пагутарылі з дырэктарам Студгарадка БДУ Міхаілам ЧАРАПЕННІКАВЫМ.***



***– Міхаіл Барысавіч, як настрой перад пачаткам новага навучальнага года?***

– Як заўсёды, выдатны. Студэнты пачалі прыязджаць 25 жніўня, але некаторыя крыху раней. У кагосьці сямейныя прычыны, хтосьці хоча дапамагчы нам у інтэрнатах. Жыццём напаўняецца ўніверсітэт, жыццём напаўняецца студэнцкі гарадок. З'яўляюцца маладыя вясёлыя твары, пасля летняга адпачынку, загарэлыя. З адчуваннем таго, што ў гэтым годзе дакладна будуць вучыцца і хадзіць на ўсе пары. Ну, і супрацоўнікі з адпачынку вярнуліся. Таму настрой класны, шчыра кажу, хоць сёлета клопатаў больш – уводзім новы інтэрнат.

***– Летам у БДУ ўліліся тысячы новых студэнтаў, амаль 2/3 з якіх іншагароднія. Як вырашаецца праблема іх размяшчэння, асабліва з улікам закрыцця двух інтэрнатаў?***

– Казаць пра закрыццё не зусім правільна. Здараюцца ў жыцці непазбежныя рэчы. Так і тут. Інтэрнату № 3 трэба капітальны рамонт – замест яго адкрываецца не менш ёмістая «сямёрка». Гэта выразная і зразумелая праграма ўніверсітэта. Свой рэсурс цяперашняя «тройка» вычарпала. Аднак цешыць, што гэта апошні інтэрнат БДУ, які рамантуецца. Усе астатнія ўжо абнавіліся. Першай ластаўкай быў пяты інтэрнат, затым шосты, першы, другі, а дзясяты і адзінаццаты – навабуды. Што датычыцца інтэрната № 4 на праспекце Пераможцаў, таксама састарэлага, то па дамоўленасці з гарадскімі ўладамі нам замест яго ўзвялі сучасны будынак на праспекце Дзяржынскага (інтэрнат № 11). Проста, дзякуючы правільным дзеянням кіраўніцтва ўніверсітэта, мы на год адцягнулі перадачу «чацвёркі» гораду. Таму нельга сказаць, што сітуацыя з жыллём у БДУ моцна пагоршылася.

Мы робім захады, каб адрэгуляваць сітуацыю з засяленнем. Першы прынцып: праінфармаваны – значыць узброены. Чым раней мы паведамім першакурсніку, ці будзе яму дадзена месца ў інтэрнаце, тым больш у яго будзе часу на пошукі кватэры. Сёлета мы яшчэ на цэлы тыдзень ссунулі тэрміны – ужо 17–18-га жніўня, а ў некаторых выпадках і раней, маглі даць дакладную інфармацыю.

Далей, універсітэт вось ужо пяты год фарміруе базу прапаноў найму кватэр праз аб'явы ў мінскіх газетах. Паслуга абсалютна бясплатная для студэнтаў і даступная з сайта *www.bsu.by*. Не выходзячы з дома, можна ў інтэрнэце паглядзець і тут жа патэлефанаваць наконт жылля. І гэта карыстаецца попытам.

Да таго ж, чацвёрты год працуе наша «гарачая лінія» па пытаннях засялення. Кожны дзень адказваем на 100–150 званкоў.

Але самае галоўнае тое, што першакурснікі наогул у прывілеяваным становішчы ў параўнанні з астатнімі курсамі. Вырашана, што кожнае чацвёртае месца ў інтэрнатах – для першакурснікаў. З 5400 месцаў, якія маем сёння, 1350 аддаецца новым студэнтам, апроч замежнікаў. Сумарна практычна 2/3 усіх першакурснікаў (разам з іншаземцамі) забяспечваюцца жыллём. Мы не дзелім студэнтаў на платнікаў і бюджэтнікаў, замежнікаў або беларусаў.

З гэтага года мы ўвялі базу даных «Студгарадок» у поўную эксплуатацыю. Зараз увесь працэс засялення ад падачы заявы на факультэце да высялення з інтэрната, у тым ліку і аплата, праходзіць онлайн.

***– А ў цэлым фармальныя крытэрыі для засялення не змяніліся?***

– Не. Аднак у сувязі з тым, што сітуацыя ў нас стала троху горшай, мы паменшылі квоты, якія давалі актывістам. Калі раней, напрыклад, засяляліся ўсе студэнцкія саветы інтэрнатаў, камітэт БРСМ з ліку іншагародніх, як і ўвесь прафкам, то цяпер гэта зможа зрабіць толькі палова з іх. Бо месцаў, як ні круці, больш не стала, а колькасць студэнтаў расце. Хоць, вядома, заўсёды марыш: «А вось калі б нам пакінулі тое і тое...», але прыходзіцца скарачаць.

***– Як тую «дзявятку» на Карла Маркса…***

– Так, «дзявятку» (230 месцаў) зачынілі яшчэ ў мінулым годзе. Яе перадалі Міністэрству культуры. Аднак страту «дзявяткі» і 800 месцаў у «чацвёрцы» нам якраз кампенсавалі ў новым і, натуральна, больш якасным інтэрнаце № 11.

І перспектывы абнадзейваюць. Ужо пачалося засяленне ў адрамантаваную «сямёрку», а «тройка» будзе здадзена ў снежні 2013 г., і пра гэта кажу з упэўненасцю, таму што яна трапіла ў праграму падрыхтоўкі аб'ектаў да чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 г. Дарэчы, менавіта пасля атрымання фінансавання рэктарат прыняў рашэнне пра капрамонт «тройкі». Гэта значыць, што рэальна ўжо ў найбліжэйшай будучыні сітуацыя зменіцца ў лепшы бок.

Мы вельмі разлічваем на яшчэ адзін інтэрнат у Студэнцкай вёсцы, бо па адным інтэрнаце там належыць усім ВНУ, а нам ён дастаўся наўзамен старых двух. Калі ўсё атрымаецца, то мы «разжывёмся» яшчэ адной тысячай месцаў у вёсцы і свае 1200 пасля рэканструкцыі «тройкі» ўвядзём. І гэта будзе першы выпадак, калі мы нешта адкрыем і пры гэтым нічога не будзем зачыняць па неабходнасці. Пачынаючы з 1997 г., калі ўводзілі «пяцёрку», мы кожны раз усведамлялі, што ўмовы пражывання студэнтаў якасна паляпшаюцца, але пры гэтым колькасць месцаў заставалася заўсёды прыкладна на адным узроўні, і ад гэтага ўзнікала дваякае пачуццё.

***– Ад тых, хто засяляецца, да тых, хто засяліўся. З якімі цяжкасцямі спраўляюцца па першым часе першакурснікі?***

– Так склалася, што ўсіх студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, мы называем паміж сабой «дзеці». І гэта ні ў кога не выклікае іроніі, бо ўспрымаецца як прыкмета асаблівай адказнасці. Кранальная сітуацыя, калі мы бяром да сябе на працу маладых спецыялістаў з ліку сваіх жа нядаўніх «дзяцей», а такіх шмат, і яны тут жа пачынаюць самі казаць пра студэнтаў: «Дзеці прыходзілі».

Што тычыцца нашых падапечных, то, паводле сацапытанняў, найбольшая колькасць прэтэнзій, як ні дзіўна, у тых, хто жыве ў новых інтэрнатах. Гэта значыць, калі ты жывеш у новым інтэрнаце, там усё класна, усё шыкоўна, усё выдатна, але джакузі няма і маленькая паркоўка… *(смяецца)*. Або амаль так. Мы апытваем штогод каля тысячы хлопцаў і дзяўчат. Выходзіць, што, калі ў нас былі яшчэ старыя «тройка-дзявятка-чацвёрка», там пераважная большасць студэнтаў была ўсім задаволеная. Адзін туалет на калідоры, два душы ў цокальным памяшканні, і, за выключэннем, вядома, дробязяў, усё добра. Вось такі парадокс.

Яшчэ адзін характэрны прыклад пра завышаную планку патрабаванняў. Да Аляксандра Міхайлавіча Радзькова на адным з нашых выязных пасяджэнняў падыходзіць студэнтка і пытаецца, ці лічыць ён нармальным, што гарачай вады няма па два дні даўжэй, чым належыць. Той пацікавіўся ў яе, адкуль яна родам. Выявілася, з нейкага невялікага пасёлка, а вада ў іх увогуле бывае толькі ў ацяпляльны сезон з канца кастрычніка па пачатак красавіка… Усе пасмяяліся, а праблема неўзабаве знялася.

Наогул, першакурснікі трапляюць у зусім іншае сацыяльнае асяроддзе. Раней ён быў адзіным сыночкам або дачушкай, і ўсе хадзілі на дыбачках, калі ён спаў, а тут у блоку такіх жыве шасцёра. І ўсе лічаць, што астатнія не павінны парушаць іх спакой. І халадзільнік чамусьці напаўняецца не сам па сабе, а мамай і татам, і трэба пачынаць гатаваць. Усім, хто з такімі праблемамі сутыкаўся, кажу: «Жыццё ў інтэрнаце – гэта навучанне камунікацыі». Вядома, прыцірка да новых умоў адбываецца ва ўсіх па-рознаму. Плюс горад вялікі двухмільённы… Таму ў студгарадку і рэалізуецца вялікая праграма адаптацыі студэнтаў, якую ажыццяўляе Цэнтр педагагічных тэхналогій. Мы сустракаемся з першым курсам на пачатку верасня ў кожным інтэрнаце. Расказваем пра ўсе структуры і паказваем дзецям, што інтэрнат – гэта насамрэч агульны дом, і, наколькі ён стане камфортным, залежыць ад іх. Дадзеная праграма на працягу ўсяго першага года прадугледжвае самыя розныя мерапрыемствы.

***– Некалькі слоў пра арганізацыю вольнага часу студэнтаў.***

– У інтэрнаце ёсць магчымасці выдатна адпачыць і пазабаўляцца. Маем пакоі адпачынку, тэніс, більярд, трэнажоры. Наогул, ёсць пласт культурна-масавай і спартыўнай работы. Мы праводзім спартакіяду па 11 відах спорту. Плюс асобны футбольны турнір, валейбольны сёлета зладзілі. Агульная ідэя арганізацыі вольнага часу студэнтаў у інтэрнатах такая: разам з вамі мы гатовы рэалізаваць практычна ўсё. Было б жаданне. Летась хлопцы з «шасцёркі» правялі турнір па спартыўным покеры. Цяпер плануем пашырыць яго на ўвесь студгарадок. Яшчэ працуюць секцыі па чэрлідынгу, баскетболе, валейболе, ушу і каратэ, настольным тэнісе, танцах, аэробіцы.

У культурна-масавым блоку наш круглагадовы фестываль студэнцкай творчасці. Там КВЗ, брэйнрынг, «Што? Дзе? Калі?», конкурсы «Міс» і «Зорная пара» і да т. п. Удзел у гэтых мерапрыемствах сапраўды для душы, прыносіць безліч станоўчых эмоцый. Гурток кройкі і шыцця таксама карыстаецца попытам. Для дзяцей са схільнасцямі да малявання працуе мастацкая майстэрня.

І нашы органы самакіравання таксама шмат чаго робяць і конкурсы свае праводзяць, да прыкладу, «Студэнцкі лідар студгарадка», і саветы вельмі актыўныя ў інтэрнатах. У гэтым асяроддзі заўсёды з'яўляюцца новыя ідэі. Задумана новае шоу «Хостэл-мікс». Пытаюся, што гэта будзе, адказваюць – убачыш…

Відовішчнымі мерапрыемствамі займаецца студэнцкая творчая лабараторыя, а спартыўнымі спартыўна-турысцкі клуб, які таксама арганізуе паездкі па Беларусі і за межы краіны. Прычым для студэнтаў-сірот яны бясплатныя. Плюс 2–3 паходы ў год.

Наша задача ў тым, каб інтэрнат стаў родным домам, а не проста месцам, куды студэнт прыйшоў, сумку скінуў, хуценька паеў, заснуў, прачнуўся і сышоў – каб гэтыя пяць гадоў прайшлі для яго цікава і карысна. Дарэчы, загадчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Віктар Антонавіч Каляда і начальнік упраўлення па справах культуры Уладзімір Міхайлавіч Макарэвіч з'яўляюцца нашымі вялікімі сябрамі і заўсёды нас падтрымліваюць.

***– Гэты год для БДУ юбілейны. Ці стане ён асаблівым для саміх студэнтаў?***

– Калі БДУ было 75, я быў на другім курсе і вельмі шкадаваў тады, што 80-годдзе не заспею. На шчасце, я трапіў і на 80 і на 85. А сёлета, спадзяюся, і ў святкаванні 90-годдзя прыму ўдзел. Юбілей, безумоўна, запамінаецца назаўжды. Гэта асаблівы год, які заўсёды праходзіць з вялікім уздымам. Суцэльнае свята. Пры гэтым мы разлічваем на добры падарунак – інтэрнат у студэнцкай вёсцы. А студэнтаў чакае шмат падзей. Візіт шматлікіх замежных гасцей таксама пакідае свой след, пачынаеш адчуваць гонар за альма-матар і сваё дачыненне, як бы гэта напышліва ні гучала, да сусветнай універсітэцкай прасторы.

Што тычыцца студгарадка, то спадзяёмся ўвасобіць вельмі цікавую ідэю. Студэнты прапанавалі арганізаваць паход на Сходню пад Масквой, куды эвакуяваўся БДУ падчас вайны, і ўсталяваць там мемарыяльную дошку. Тым і добры кожны юбілейны год, што дазваляе ўспомніць гісторыю і зрабіць для сябе адкрыцці. Упэўнены, што і для цяперашніх першакурснікаў ён таксама стане незабыўным.

**Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

*Новае аблічча інтэрната №7*

У ПРАФКАМЕ

# А што вы можаце нам даць?

***Конкурс на найлепшае ўступленне першакурснікаў розных факультэтаў у сваe шэрагі праводзіць напачатку навучальнага года пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.***

Маладыя лідары ладзяць **святочныя прэзентацыі** з мэтай прадэманстраваць сваю працу ў прафсаюзных бюро, расказваюць пра прафсаюзны рух ва ўніверсітэце. У першыя дні верасня ў новых студэнцкіх групах выбіраюць прафгрупаргаў, якія на працягу года будуць займацца сацыяльнымі пытаннямі. Менавіта прафгрупарг павінен дамагчыся як мага большага ўступлення студэнтаў у прафсаюз. За свае намаганні ён будзе ўзнагароджаны дыпломам і прэміяй. А студэнты групы, пра дабрабыт якой ён клапоціцца, займеюць магчымасць пабываць на экскурсіях, наведацца ў тэатры, музеі, а таксама цікава правесці свой вольны час.



*Прэзентацыя студэнцкага прафсаюза ў Дзень ведаў у БДУ*

Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніна РАДЗЕВІЧ кажа, што мэтавыя мерапрыемствы дазволілі зрабіць арганізацыю самай шматлікай у сістэме адукацыі.

**На 1 чэрвеня 2011 г. ахоп прафсаюзным членствам ва ўніверсітэце склаў 89%.** У структуры прафсаюзнай арганізацыі БДУ 19 прафбюро і ажно 767 прафсаюзных груп. Каб дасягнуць такіх высокіх паказчыкаў, прыйшлося нямала пазмагацца за сваіх членаў. «Калі раней у прафсаюзы ішлі па пуцёўку ў санаторый, па матэрыяльную дапамогу, па месца ў інтэрнаце, то сёння гэтыя сацыяльныя пытанні бяруцца вырашаць іншыя грамадскія арганізацыі і адміністрацыйныя органы, і студэнты ў разгубленасці. «А што вы можаце нам даць?», – такое пытанне часта чуем ад нашых наведнікаў, – расказвае Ніна Міхайлаўна. – Мы вымушаны неаднаразова тлумачыць, што акрамя матэрыяльнай дапамогі яны могуць разлічваць на тое, што прафсаюзная арганізацыя абароніць іх сацыяльнаэканамічныя правы і прадставіць законныя інтарэсы ў любой складанай сітуацыі».

У прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ вельмі добра наладжана работа **прававой камісіі**. У мінулым годзе, напрыклад, з яе дапамогай была праведзена сустрэча з галоўным прававым інспектарам працы Ларысай Манюк і намеснікам старшыні ЦК Беларускага прафесійнага саюза супрацоўнікаў адукацыі і навукі Раманам Дапірам. Тут заўсёды можна атрымаць бясплатную юрыдычную кансультацыю па пытаннях размеркавання, арганізацыі вучэбнага працэсу, аплаты за навучанне, часовага і пастаяннага працаўладкавання. Справіцца з прававымі праблемамі часта дапамагаюць студэнты юрыдычнага факультэта. Напрыклад, яны ў стане дапамагчы разабрацца, які студэнт з прававога пункта погляду лічыцца малазабяспечаным. Іх высновы распаўсюджваюць праз прафсаюзных лідараў у групах.

Побач з такімі традыцыйнымі камісіямі, як камісія па жыллёвабытавой рабоце, вучэбна-вытворчай і сацыяльнай рабоце, а таксама аздараўленчай, фізкультурнамасавай і спартыўнай рабоце, нядаўна з'явілася новая **камісія – па рабоце сярод жанчын, ахове сям'і, мацярынства і дзяцінства.** Дапамога студэнцкім сем'ям, якія маюць дзяцей-школьнікаў, была ўскладзена якраз на яе.

«Калегі з іншых ВНУ заўсёды з цікавасцю ставяцца да нашых напрацовак, – не прамінаюць пахваліцца ў камітэце прафсаюзаў студэнтаў БДУ, – бо падзяліцца ёсць чым. У нас праводзіцца шмат акцый, напрыклад, сустрэчы з медыцынскімі супрацоўнікамі пад лозунгам «Здароўе нацыі – у руках маладых», або такіх, як «Будзь разам з намі!», «З прафсаюзамі разам па жыцці» і г. д., прызначаных спецыяльна для першакурснікаў.

Да 90-годдзя галіновага прафсаюза адукацыі і навукі ва ўніверсітэце аб'явілі **конкурс на найлепшае прафсаюзнае бюро факультэта**, падчас якога будуць улічвацца ажно восем кірункаў дзейнасці. Гэта дасць магчымасць стымуляваць і актывізаваць работу прафгрупаргаў і прафсаюзных лідараў. Менавіта яны павінны ведаць пра ўсе падзеі, якія адбываюцца на факультэце. Сёння ім прыходзіцца аналізаваць вынікі паспяховасці і іх уплыў на пытанні стыпендыяльнага забеспячэння, скідак, пераводаў, адлічэнняў, адпачынку і г. д. Яны валодаюць звесткамі, хто са студэнтаў не мае аднаго або абодвух бацькоў, знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, паходзіць са шматдзетнай сям'і, з'яўляецца сам інвалідам або мае бацькоў-інвалідаў ці бацькоў-пенсіянераў і г. д. Сацыяльная характарыстыка прафгрупы дае магчымасць своечасова адклікацца на матэрыяльныя патрэбы студэнтаў.

Вынікі конкурсу яшчэ будуць падводзіцца. Але ў камітэце ўпэўнены, што прафсаюзны рух сярод студэнтаў БДУ набірае моц. «Інакш думаць не прыходзіцца, калі ёсць такія прафсаюзныя бюро, як, напрыклад, на гістарычным факультэце, – тлумачыць Ніна Радзевіч. – Яшчэ новы навучальны год не пачаўся, а яго старшыня, студэнт 4-га курса гістарычнага факультэта Аляксандр Луцэвіч ужо зрабіў справаздачу, якія мерапрыемствы праведзены для таго, каб як мага болей студэнтаў першага курса ўступіла ў шэрагі галіновага прафсаюза. Ён сачыў за засяленнем студэнтаў у інтэрнаты БДУ, а таксама сабраў інфармацыю наконт правоў студэнтаў-платнікаў на скідкі.

Фота самых лепшых студэнтаў у пярвічцы вывешваюць **на дошку гонару ўласнага сайта**. Тут жа красуюцца ўсе стыпендыяты галіновага прафсаюза ад універсітэта.

Прафсаюзы не дзеляць сваіх членаў на студэнтаў дзённай формы навучання і студэнтаў-платнікаў. Яны аднолькава клапоцяцца і пра адных і пра другіх. Летась было распрацавана, а ў чэрвені гэтага года дапоўнена Палажэнне аб парадку аказання матэрыяльнай дапамогі за кошт сродкаў пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтам БДУ, якія атрымліваюць I і II ступень вышэйшай адукацыі, а таксама навучэнцам і аспірантам дзённай формы навучання. У ім улічаны ўсе катэгорыі студэнтаў. Шмат надзей на новыя сацыяльныя гарантыі і правы студэнтаў дае **праект пагаднення паміж БДУ і пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў БДУ на 2011–2013 гады**, які быў распрацаваны нядаўна.

**Гутарыла**
**Ганна ЛАГУН**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

**Сярэбраныя медалі заваявала каманда Беларусі на 24-м міжнародным турніры юных фізікаў у Тэгеране (Іран).**

Нашу краіну прадстаўляла каманда-пераможца рэспубліканскага турніру, сфарміраваная на базе ліцэя БДУ. У яе складзе: ліцэісты Станіслаў Красулін, Мікіта Крэс, Яўген і Рыгор Гунько, Ганна Ачапо падрабязнасцях ўская і навучэнка сталічнай гімназіі № 29 Юлія Сапронава. Кіраўнікі каманды – студэнты факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Аляксандр Мамойка і Іван Анціпаў.

У спаборніцтвах удзельнічалі прадстаўнікі 23 краін, у тым ліку Аўстрыі, Германіі, Швецыі, Кітая, Кеніі, Бразіліі, Сінгапура.

Штогод Сусветны кубак фізікі (Physics World Cup), як яшчэ называюць турнір, збірае ў шэрагах гледачоў і журы найлепшых навукоўцаў і выкладчыкаў вядучых універсітэтаў.

Удзел нашай каманды ў гэтых прэстыжных спаборніцтвах ажыццёўлены пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, БДУ і іранскай кампаніі «Кейсан».



*Каманда Беларусі: Станіслаў Красулін, Рыгор Гунько, Юлія Сапронава, Яўген Гунько, Ганна Ачапоўская*

* * *

**Навучэнец XI класа ліцэя БДУ Генадзь Клімук заваяваў сярэбраны медаль на міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы, якая прайшла ў Амстэрдаме (Нідэрланды) 12–24 ліпеня.**

Бронза дасталася адзінаццацікласніку Уладзіславу Сатанеўскаму, а пахвальны водгук прывезла дадому дзесяцікласніца ліцэя БДУ Марыя Манкевіч. Усяго ў алімпіядзе ўдзельнічалі шасцёра школьнікаў з Беларусі.

* * *

**Дзесяцікласнікі ліцэя БДУ заваявалі сярэбраны і бронзавы медалі на 43-й міжнароднай хімічнай алімпіядзе, якая адбылася ў Анкары (Турцыя) з 9 па 18 ліпеня.** «Серабро» атрымаў Яўген Анiскевіч, а «бронзу» – Аляксей Краўцоў. Усяго ж у складзе беларускай каманды былі 4 чалавекі.

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**БДУ заняў 1208-е месца ў сусветным вебаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў** – БелТА, belniva.by, ej.by, nn.by, БелаПАН (1.8), tut.by, date.bs, naviny.by, ale.by, «Минск-новости», belaruspartisan.org, «Рэспубліка» (2.8), «Минский курьер» (3.8).

**Кошт платнага навучання ў ВНУ краіны** – belniva.by, tut.by, Euroradio (2.8), kp.by, naviny.by, generation.by, nv-online.info.by, «Звязда» (3.8), «7 дней» (4.8), «Экономическая газета» (12.8).

**Высокі ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў** – interfax.by, naviny.by (2.8), «Минск-новости» (3.8).

**Навуковыя распрацоўкі БДУ** – «Рэспубліка» (2.8).

**Пра ўдзел спартсменаў-студэнтаў БДУ ў сусветнай універсіядзе ў Кітаі** – БелТА, naviny.by (3.8), belniva.by (13.8).

**Пра дзейнасць Рэспубліканскай летняй навукова-даследчай школы** – tut.by (4.8).

**Перамогі БДУ ў міжнародных конкурсах па праграмаванні** – tut.by (8.8), «Настаўніцкая газета» (16.8).

**Размеркаванне выпускнікоў ВНУ** – «СБ – Беларусь сегодня» (10.8).

**Канчатковыя вынікі ўступнай кампаніі БДУ** – «Минск-новости» (10.8), «Вечерний Минск» (18.8).

**Размеркаванне месцаў у інтэрнатах БДУ** – Euroradio (10.8), belaruspartisan (16.8).

**Пачалося будаўніцтва біятэхналагічнага комплексу па праграме «БелРасТрансген–2» з удзелам навукоўцаў БДУ** – БелТА (15.8).

**БДУ і Гродзенскі медуніверсітэт падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве** – naviny.by, БелаПАН, БелТА, zn.by (15.8).

**Каментар М. Кавалёва наконт сітуацыі на сусветным валютным рынку** – zvyazda.by (15.8).

**Інтэрв'ю рэктара БДУ С. Абламейкі** – «СБ-Беларусь сегодня» (17.8).

**Вытворчая практыка замежных студэнтаў у БДУ** – «Настаўніцкая газета» (18.8).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

*Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Іншае жыццё, іншыя правілы. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па ўніверсітэце і яго структурах – «Школу першакурсніка». З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем рады вам дапамагчы.*

## ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

**«КРЫЖАЧОК» – заслужаны аматарскі ансамбль танца**

Заснаваны ў 1945 г. «Крыжачок» заваёўваў шматлікія ўзнагароды на многіх фестывалях і конкурсах. У красавіку 2011 г. «Крыжачок» атрымаў ганаровае званне «заслужаны». Мастацкі кіраўнік – Ігар Музалеўскі.

**«НЕРУШ» – заслужаны аматарскі фальклорна-этнаграфічны ансамбль**

Збірае нацыянальную музыку, песні, абрады і звычаі ў фальклорных экспедыцыях па Беларусі. У 1985 г. ансамбль атрымаў званне «народны».

У сакавіку 2011 г. «Неруш» адзначыла 30-годдзе яркай прэм'ерай народнага мюзікла «Вяселле ў Стараселлі». Мастацкі кіраўнік – Валянціна Гладкая, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, кіраўнік аркестра – Іосіф Рэут, хормайстар – Алена Бялько.

**НАРОДНЫ АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ**

Калектыў заснаваны ў 1946 г. А ў 1965 г. атрымаў ганаровае званне «народны».

У рэпертуары: пераклады класічнай музыкі, апрацоўкі беларускіх і рускіх народных песень, песні народаў свету, старажытныя рамансы, творы беларускіх кампазітараў. У 2011 г. аркестр стаў лаўрэатам IV Міжнароднага фестывалю-конкурсу LIBERTANGO імя А. П'яцолы.

Мастацкі кіраўнік і дырыжор – Сяргей Сальнік, канцэртмайстар – Ірына Макарэвіч.

**НАРОДНАЯ АКАДЭМІЧНАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА**

Адзін з найстарэйшых калектываў БДУ. У 2011 г. яму споўніцца 65 гадоў.

У рэпертуары музыка розных перыядаў: старажытная беларуская, руская і заходняя музыка, музыка Сярэдніх вякоў, XIX стагоддзя і сучасная.

Калектыву прысуджаны званні «народны» і «акадэмічны». З 2006 г. капэла БДУ з'яўляецца адным з заснавальнікаў міжнароднага форуму студэнцкіх хароў «Папараць-кветка». Мастацкія кіраўнікі і дырыжоры – Вольга і Аляксандр Мінянковы.

**«НА БАЛКОНЕ» – народны драматычны студэнцкі тэатр**

Адзін з найстарэйшых студэнцкіх калектываў краіны. Заснавальнік міжнароднага фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар». З 2006 г. член Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў AITU/IUTA. Мастацкі кіраўнік, рэжысёр – Сяргей Турбан.

**«НА ФІЛФАКУ» – народны музычны тэатр-студыя**

Заснаваны ў 1997 г. Яго стваральнікамі і першымі рэжысёрамі былі Л. І. Ярмак і С. Я. Глебаў. Уладальнік Гран-пры ІІ Міжнароднага фестывалю «Тэатральны куфар».

Мастацкі кіраўнік, рэжысёр – Вера Машэўская.

**«РОДНІЦА» – народны хор народнай песні выкладчыкаў і студэнтаў**

Заснаваны ў 1979 г. Адзін з самых цікавых аматарскіх калектываў народнай песні ў краіне. У яго рэпертуары, акрамя беларускіх, песні польскага, украінскага, рускага і іншых народаў.

Мастацкі кіраўнік – Уладзімір Зяневіч, прафесар.



*Заслужаны аматарскі ансамбль танца «Крыжачок»*

**«ТУТЭЙШАЯ ШЛЯХТА» – народны фальклорны ансамбль**

Ансамбль вылучаецца сваёй яркай індывідуальнасцю. Рэпертуар калектыву складаецца ў асноўным з беларускіх народных песень, калісьці папулярных у асяроддзі шляхты. Імкнецца да мяккай, лірычнай, інтэлігентнай манеры выканання і карыстаецца шырокай папулярнасцю. Мастацкія кіраўнікі – Леанід і Анатоль Махначы.

**«СЁМАЕ НЕБА» – ансамбль эстраднага танца**

Кірункі: мадэрн, джаз-мадэрн, танец жывата, лаціна, фламенка.

З'яўляецца лаўрэатам VI фестывалю выканаўцаў эстраднай песні і танца «Белая Русь–2002», уладальнікам Гран-пры І Чэмпіянату Беларусі па танцы жывата «Усходнія прысмакі–2003».

Калектыў гастраляваў у Швейцарыі, Бахрэйне, ААЭ.

Мастацкі кіраўнік – Алег Тарасаў, харэограф – Наталля Тарасава.

**ВАКАЛЬНАЯ СТУДЫЯ БДУ**

Удзельнікі студыі неаднаразова станавіліся лаўрэатамі розных конкурсаў.

Найбольш выдатныя выпускнікі студыі – спявачка Corriana, Вольга Палюшык (салістка гурта ProSSpekt), Антон Мартынаў.

Мастацкі кіраўнік – Людміла Мурачова.

**КЛУБ АЎТАРСКАЙ ПЕСНІ БДУ**

Заснаваны 24 лістапада 1999 г., клуб захоўвае найлепшыя традыцыі песеннай і паэтычнай творчасці, падтрымлівае маладых выканаўцаў, паэтаў, кампазітараў.

З'яўляецца заснавальнікам фестывалю акустычнай музыкі «ФЭСТ-А».

Мастацкі кіраўнік – Вольга Акуліч (Ярмоленка).

Акрамя таго, у БДУ дзейнічаюць **мужчынскі вакальны ансамбль «Галант», дзіцячы ансамбль танца «Літарынка», Клуб інтэлектуальных гульняў, КВЗ БДУ.**

**Вас чакаюць ва ўпраўленні па справах культуры па адрасе: прасп. Незалежнасці, 4, каб. 211, тэл. 209-54-69.**

## ПАХОД У БІБЛІЯТЭКУ

***Бібліятэка падчас навучання становіцца неад'емным памочнікам студэнтаў: тут можна знайсці адказы амаль на ўсе пытанні. Каб праца ў бібліятэцы была эфектыўнай, варта ведаць, як гэты храм ведаў функцыянуе і якія паслугі прапануе.***

Кожны студэнт БДУ адносіцца да аднаго з 9 абанементаў, дзе мае права браць літаратуру з фонду бібліятэкі дамоў. Таксама студэнты могуць наведваць усе 15 чытальных залаў, размешчаных на кожным факультэце, і 2 медыябібліятэкі. Акрамя традыцыйных выданняў, у бібліятэцы ёсць доступ да паўнатэкставых і бібліяграфічных баз даных з навуковай і адукацыйнай інфармацыяй. У 2010 г. уведзена ў эксплуатацыю Электронная бібліятэка БДУ (*www.elib.bsu.by*).

Фундаментальная бібліятэка БДУ аказвае як традыцыйныя, так і дадатковыя паслугі. Сярод бясплатных – атрыманне неабходнай інфармацыі пра фонды бібліятэкі, карыстанне карткавымі і электронным каталогамі, картатэкамі, базамі даных, выдача ў часовае карыстанне друкаваных выданняў, навучанне студэнтаў пошуку інфармацыі ў базах даных, арганізацыя разнастайных выстаў, прэзентацый і інш.

З 2004 г. у бібліятэцы ўведзены платныя паслугі. Яны скіраваныя, з аднаго боку, на спрашчэнне працы студэнта ў бібліятэцы, з другога – на збор сродкаў для далейшага папаўнення фондаў. Гэта выдача кніг з чытальных залаў на ноч або на 1 гадзіну; працягванне тэрміну карыстання ўзятай дамоў літаратуры, калі на яе няма попыту з боку іншых чытачоў; тэматычныя падборкі літаратуры бібліятэкарам па запыце студэнта; афармленне і рэдагаванне бібліяграфічных спісаў да навуковых, дыпломных, курсавых і іншых прац; ксеракапіраванне, сканаванне і перфапераплёт дакументаў і г. д. Праз службу электроннай дастаўкі дакументаў чытачы могуць замовіць электронныя копіі артыкулаў, адсутных у фондзе бібліятэкі.

ФБ БДУ таксама займаецца платнай перадачай спісаных з яе фондаў выданняў. У будынку філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31) у каб. 124 у будныя дні з 11 да 16 гадзін дзейнічае выстава-продаж мастацкай, філалагічнай, гістарычнай, навукова-папулярнай літаратуры і кніг на замежных мовах.

**Па дадатковую інфармацыю можна звяртацца на сайт ФБ БДУ *www.library.bsu.by* ці па тэлефонах 209-50-82 і 209-50-33.**



## СТАНЬ ЛІДАРАМ!

***Падчас навучання ў БДУ маладыя людзі становяцца не толькі спецыялістамі ў абранай сферы – яны вучацца быць сапраўднымі грамадзянамі краіны. Вялікую ролю ў гэтай справе адыгрываюць студэнцкія арганізацыі альма-матар.***

**БРСМ БДУ**

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі БДУ аб'ядноўвае ініцыятыўных і пазітыўных маладых людзей. Прыйшоўшы да нас, ты зможаш рэалізаваць свой патэнцыял і сфарміраваць у сабе лідарскія якасці.

Мы ўмацоўваем традыцыі альма-матар і арганізуем мерапрыемствы, якія ўжо сталі візітоўкамі БРСМ БДУ: "Універсітэт – твой крок у будучыню", універсітэцкі турысцкі злёт, форум «Стань лепшым».

Запрашаем у наш дружны калектыў!

**Грамадскае аб'яднанне «Студэнцкі саюз БДУ»**

Студсаюз заснаваны ў сакавіку 1997 г. з ініцыятывы студэнтаў. Мы спрыяем маладым у раскрыцці іх здольнасцяў і талентаў, а таксама развіваем студэнцкае самакіраванне і традыцыі ў БДУ.

Студэнцкі Саюз – гэта дружная каманда творчых студэнтаў, якім не абыякава, што іх атачае і дзе яны вучацца. Сфера дзейнасці Студсаюза не абмяжоўваецца ўніверсітэтам, ён супрацоўнічае са студэнцкімі і моладзевымі арганізацыямі замежных ВНУ.

У нас ёсць цікавыя праекты, да якіх могуць далучыцца ўсе ахвотныя: агляд-конкурс «Капуснік» (для першакурснікаў), «Студэнцкі адукацыйны клуб «БРЫЗ», «Восеньскі баль», «Клуб лідараў», конкурс прыгажосці «Міс БДУ», «Фотагалерэя «Універсітэт – гэта мы!», «Мая школа» (занняткі з дзецьмі са школ і дзіцячых дамоў) і інш.



*Круглы стол з удзелам рэктара БДУ*

З намі ў цябе будзе ўнікальная магчымасць стварыць свой праект!

**Савет старастаў БДУ**

У вясёлым, але ў той жа час складаным універсітэцкім жыцці студэнцкай групе бывае цяжка прайсці без рулявога. Для гэтага і патрэбны старасты. Яны дапамагаюць вырашаць пытанні па вучобе, камунікуюць з дэканатам. Ад іх залежыць агульны настрой у групе. Яны могуць зрабіць вучобу не толькі эфектыўнай, але і вясёлай і запамінальнай.

Каб дапамагаць старастам і каардынаваць іх працу, быў створаны Савет старастаў БДУ. Савет старастаў удзельнічае ў арганізацыі мноства ўніверсітэцкіх мерапрыемстваў – ад агульных святаў да студэнцкіх канферэнцый, семінараў і практыкумаў.

Стань лідарам – стань старастам!

**Студэнцкі савет па якасці адукацыі**

Створаны ў 2003 г. Яго мэтай з'яўляецца вылучэнне і аналіз праблем, якія існуюць у сферы адукацыі, а таксама распрацоўка прапаноў па іх вырашэнні.

ССЯА праводзіць штогадовае анкетаванне студэнтаў; уносіць прапановы па рэарганізацыі працы факультэцкіх бібліятэк; займаецца маніторынгам вынікаў экзаменацыйных сесій; вядзе працу, скіраваную на стварэнне электроннага каталога фондаў універсітэцкай бібліятэкі, а таксама інфармацыйнай базы вучэбна-метадычнай літаратуры.

ССЯА – гэта рэальны шанец самастойна палепшыць наша студэнцкае жыццё.

**Звяртайцеся ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю: прасп. Незалежнасці, 4, галоўны корпус, каб. 202, 205, 207, тэл. 209-55-59, 209-52-61, 209-50-59.**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

1 верасня 2011 года
Падпісана да друку 30.08.2011 г.
Зак. 559. Тыраж 2000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА




Фота Аляксандра СНАПКА

Псіхалагічная служба БДУ створана больш за 10 гадоў таму для дапамогі студэнтам і супрацоўнікам універсітэта. Спецыялісты службы, працуючы па прынцыпах «ПРАФЕСІЯНАЛЬНА-АНАНІМНА-БЯСПЛАТНА», праводзяць **групавыя і індывідуальныя** мерапрыемствы.

Мэты мерапрыемстваў розныя. Пазначыўшы іх адным словам, атрымліваем групы: **Рашэнне, Падтрымка, Зносіны, Самапазнанне, Веды, Практыка** (глядзіце схему). Менавіта з такімі запытамі часцей за ўсё сутыкаюцца спецыялісты-псіхолагі.

• Калі ў студэнта ёсць запыт адносна практычных навыкаў (Практыка), яму падчас індывідуальнай працы прапануюць **псіхалагічныя практыкаванні** ці зарыентуюць на **трэнінгі** і **практычныя заняткі** (групавыя мерапрыемствы).

• Калі асноўны запыт – Зносіны, праводзяцца **індывідуальныя гутаркі** або студэнта запрашаюць на сустрэчы **студэнцкага псіхалагічнага клуба.**

• Калі ёсць нейкая праблемная сітуацыя, для якой трэба знайсці Рашэнне, запрашаем на **кансультацыі.** Калі студэнтам патрэбная дапамога ў падрыхтоўцы і правядзенні праектаў, дабрачынных акцый, валанцёрскіх мерапрыемстваў, рашэнне можна знайсці ў рамках **творчай майстэрні.**

• На пошук і набыццё Ведаў эфектыўна працуе **псіхалагічная лабараторыя** (прастора эксперыментаў і крэатыву), а ў індывідуальным рэжыме псіхолагі заўсёды дапамогуць у **падборы матэрыялу па запыце.**

• Падтрымка студэнтаў – гэта **індывідуальныя праграмы** па пераадоленні цяжкіх жыццёвых сітуацый, барацьбе з дрэннымі звычкамі, паляпшэнні памяці, увагі і інш. Групавая падтрымка – гэта, у першую чаргу, **псіхалагічныя гасцёўні.** На іх можна не толькі добра прабавіць час, але і даведацца што-небудзь новае для сябе.

• Нарэшце, тых, хто цікавіцца Самапазнаннем, несумненна, прыцягне магчымасць праходжання індывідуальнай або групавой **псіхалагічнай дыягностыкі.**

**І яшчэ…**

Магчымасці плённай сумеснай працы студэнтаў, выкладчыкаў і псіхолагаў не вычэрпваюцца пералічанымі мерапрыемствамі. Тэлефануйце, пытайце, даведвайцеся!




## АНОНС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

### на першы семестр 2011–2012 навучальнага года

| | Верасень | Кастрычнік | Лістапад | Снежань |
|---|---|---|---|---|
| Трэнінгі і трэнінгавыя модулі | 21, 22.09 Трэнінгавы модуль «Адаптацыя 1-га курсу «Асновы супольнага жыцця» | 12.10 – 1 занятак трэнінгу «Упэўненасці ў сабе» (усяго 8 заняткаў) 19.10 – 1 занятак трэнінгу «Таемны шыфр жаночых казак» (8 заняткаў) 17.10, 24.10 Трэнінгавы модуль па крэатыўнасці 26.10 – 1 занятак трэнінгу зносін | 16, 17.11 Трэнінгавы модуль «Камунікаваць з задавальненнем» 16. 11 – 1 занятак адаптацыйнага трэнінгу для студэнтаў-першакурснікаў 16.11, 23.11 Трэнінгавы модуль «Эмацыйная самарэгуляцыя» | 07, 14.12 Трэнінгавы модуль «Рэлаксацыйныя тэхнікі» |
| Практычныя заняткі | 07.09 «Мы – разам!» 26.09 «Падары сабе мару!» 28.09 «Эфектыўная камунікацыя» | 05.10 «Асновы публічных выступленняў» 06.10 «Таямніца вашага імя» 10.10 «Камандаўтварэнне. Згуртаванне групы» 12.10 «Праўда пра хлусню» | 02.11 «Крыніца багацця» 09.11 «Эфектыўны тайм-менеджмент» 15.11 «Кінестэтычная радасць» | 07.12 «Мастацтва кіраваць сабой» 08.12 «Вучымся выступаць публічна» 14.12 «Экзаменацыйны стрэс, або Жыццё падчас сесіі» 19.12 «Паспяховае працаўладкаванне» 21.12 «Вучыцца? Лёгка!» |
| Псіхалагічныя гасцёўні | 21.09 «Размалюем восень сваімі фарбамі» 28.09 «Вячоркі ў псіхолага» 28.09 «Давайце знаёміцца!» | 18.10 «Уся праўда пра хлусню» 26.10 «Інтэрнэт-залежнасць, або Жыццё ў сетцы» 31.10 «Самапазнанне, або Межы мужнасці і жаноцкасці» | 03.11 «Маўчанне – золата» 21.11 «Сімволіка колеру» 28.11 «Чуткі і плёткі» | 14.12 «Сесія: стратэгія поспеху» 21.12 «Псіхалагічныя аспекты падрыхтоўкі да сесіі» |
| Іншыя мерапрыемствы | 13.09 Ролевая гульня «Царамок, або Як знайсці месца пад сонцам» 15.09 Відэасалон 29.09 Студэнцкі псіхалагічны клуб | 06.10 – 1 сустрэча групы сустрэч «Жальцеся – выхваляйцеся» (штотыдзень па чацвяргах) 13.10 Відэасалон 27.10 Студэнцкі псіхалагічны клуб | 10.11 Відэасалон 14.11, 21.11 Відэасалон «Практыка публічных выступленняў» 24.11 Дзелавая гульня «Катастрофа ў пустыні» 24.11 Студэнцкі псіхалагічны клуб | 01.12 Відэасалон 13.12 Ролевая гульня «Папялушка, або Выйсці сухім з вады» 15.12 Студэнцкі псіхалагічны клуб |

**УВАГА! САЦЫЯЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНЫЯ ЦЭНТРЫ АДЗНАЧАНЫ РОЗНЫМІ КОЛЕРАМІ.**
**Чорны – сацыяльна-псіхалагічны цэнтр па вул. Кастрычніцкая, 2-308 (інтэрнат № 2). Кантактны тэлефон (017) 328-60-37. Пачатак мерапрыемстваў – 18.00. Студэнцкі псіхалагічны клуб і відэасалон пачынаюцца ў 19.00.**
**Сінім – па вул. Курчатава, 8, пакой студсавета (інтэрнат № 10). Кантактны тэлефон 278-13-27. Пачатак мерапрыемстваў – 18.30.**
**Фіялетавым – па вул. Кастрычніцкая, 10а-801 (інтэрнат № 7). Пачатак мерапрыемстваў – 18.00.**
**Зялёным – па пр. Дзяржынскага, 87-128 (інтэрнат № 11). Кантактны тэлефон 259-74-93. Пачатак мерапрыемстваў – 18.00.**
**УВАГА! У праграме мерапрыемстваў магчымыя змены!**

## П

**ПАМЯЦЬ**



***Рэкамендацыі для добрага запамінання***

Матэрыял варта паўтарыць 4 разы: адразу пасля чытання, затым праз 30 хвілін, праз 8 гадзін пасля другога паўтарэння і праз суткі пасля трэцяга паўтарэння. Варта паўтараць прачытаны тэкст сваімі словамі і глядзець у кнігу, толькі калі не атрымліваецца ўспомніць матэрыял на працягу 2–3 хвілін.

У пачатку працы запамінайце лёгкі матэрыял (20 хвілін), а потым больш складаны. Адпачываць трэба праз кожныя 40–50 хвілін працы на 5–10 хвілін, пры гэтым найлепшы адпачынак – гэта фізічныя, дыхальныя і псіхатэхнічныя практыкаванні.

## С

**САМААЦЭНКА**



**Як падняць самаацэнку:**

- Не параўноўвайце сябе з іншымі людзьмі.
- Кожны дзень даведвайцеся пра што-небудзь новае і рабіце тое, што ніколі раней не рабілі.
- Займіцеся фізічнай падрыхтоўкай.
- Абнавіце знешні выгляд.
- Дазвольце сабе быць недасканалым!
- Размаўляйце з пазітыўнымі і ўпэўненымі людзьмі, гатовымі Вас падтрымаць.
- Дзейнічайце! Калі Вы дзейнічаеце, незалежна ад атрыманага выніку, расце Ваша пачуццё самапавагі.



## І

**ІЛЮЗІІ**



*Далёка не заўсёды мы бачым тое, што ёсць насамрэч. Наглядны прыклад гэтага – ілюзіі ўспрымання.*

Светлыя прадметы на цёмным фоне здаюцца большымі за свае сапраўдныя памеры. Белы квадрат здаецца значна большым адносна чорнага квадрата на белым фоне.

***Цікава!** Ведаючы пра ўласцівасць чорнага колеру прыглушваць памеры, дуэлянты лічылі за лепшае страляцца менавіта ў чорных касцюмах, спадзеючыся, што праціўнік прамахнецца.*

## Х

**ХАРАКТАР**

*У майго сябра «цяжкі» характар. Ці можна яго палепшыць? (Пытанне брыфінгу на Днях псіхалогіі на геаграфічным факультэце)*

Галоўная парада – любыя змены пачынайце з сябе. Задумайцеся, што Вас не задавальняе ў Вашым сябру, і паспрабуйце з ім гэта абмеркаваць у манеры павагі і разумення. Мы не маем права змяняць іншых людзей. Калі для Вас сапраўды каштоўныя Вашы адносіны, то Вы знойдзеце агульную мову.

## А

**АПТЫМІЗМ**



Навучанне аптымізму пачынаецца з таго, што мы прыслухоўваемся да таго, як мы апісваем добрыя і дрэнныя рэчы, якія адбываюцца з намі. Думайце аптымістычна! Рабіце гэта як фізічныя практыкаванні. Па меры таго, як гэтыя практыкаванні будуць атрымлівацца ўсё лепш, голас унутранага песіміста ў Вас будзе ўсё цішэйшы і цішэйшы.

## Л

**ЛЯНОТА**

За лянотай можа стаяць стомленасць (фізічная або эмацыйная), адсутнасць зацікаўленасці, няўпэўненасць у сабе, страх і іншае.

***Як пазбавіцца ад ляноты:***

- Сябруйце са спортам, вядзіце здаровы лад жыцця,
- Развівайцеся эмацыйна,
- Трэніруйце свой розум,
- Камунікуйце з задавальненнем,
- Выкарыстоўвайце напрацоўкі з сістэмы тайм-менеджменту,
- Знайдзіце мэту ў сваім жыцці.



## О

Што намалявана злева? Літара **«О»**? Гэта фактычны, але не крэатыўны адказ. Што яшчэ гэта можа быць? Уявіце, што Вы дамалёўваеце гэты знак. Атрымліваем мяч, твар, сярэдзінку кветкі, кола і г. д. – адказы цалкам розная ступені крэатыўнасці.

Гэта самае простае практыкаванне скіравана, па-першае, на дыягностыку ўзроўню развіцця крэатыўнасці, а па-другое, на развіццё дадзенай здольнасці. Крэатыўнасць як рысу асобы можна развіваць, што з поспехам даказваюць удзельнікі розных творча арыентаваных трэнінгаў.

## Г

**ГІПНОЗ**



Усе мы жывём у свеце гіпнатычных намоў. У некаторых выпадках неабходна ўмець супрацьстаяць намове. Для гэтага трэба:

1. Быць усвядомленым, быць самім сабой. Больш уважліва сачыць за сабой, сваімі думкамі, дзеяннямі, учынкамі.
2. Выстаўляць «абароны» вакол сябе. Гэта можна зрабіць з дапамогай візуалізацыі. Напрыклад, размаўляючы з непрыемным чалавекам, проста ўявіце паміж Вамі сцяну, люстраны шчыт – усё тое, на што здольнае Ваша ўяўленне.

## І

**ІНТУІЦЫЯ**



**Інтуіцыя** – здольнасць прымаць правільныя рашэнні хутка і лёгка. Інтуітыўны працэс можна актывізаваць, выкарыстоўваючы наступны метад.

1. Уявіце сябе Летуценнікам. Прыдумайце як мага больш варыянтаў рашэння задачы, якая стаіць перад Вамі. Не крытыкуйце, дапускайце самыя вар'яцкія ідэі.
2. Уявіце сябе Крытыкам. Прааналізуйце ідэі Летуценніка, паспрабуйце ў кожнай з іх знайсці штосьці карыснае.
3. Зараз Вы Рэаліст. Праглядзіце атрыманы Крытыкам спіс. Што Вы рэальна можаце пачаць рабіць ужо сёння. Дзейнічайце!

## Я

**«ЯКАР»**



У адной з галін практычнай псіхалогіі ёсць такое паняцце, як «Якар». Гэта сувязь паміж з'явамі па прынцыпе асацыяцыі. Можна адмыслова ствараць сувязь-якар, каб актывізаваць запамінанне навучальнага матэрыялу. Пры падрыхтоўцы да іспыту вучыце тэмы ў розных месцах (у розных частках пакоя або наогул у розных памяшканнях). Тое, што Вы бачыце і чуеце, у памяці звязацца з завучаным матэрыялам. Выцягнуўшы білет на іспыце, падрабязна ўспомніце тое месца, дзе Вы рыхтавалі тэму, якая Вам трапіла. Гэта ўспамін актывізуе засвоеныя веды, і Вы самі здзівіцеся, як шмат Вы запомнілі.

# ПСІХАЛОГІЯ І СВЯТА

Святы ў чалавечай супольнасці існуюць са спрадвечных часоў. Свята аб'ядноўвае, адцягвае ад будзённых трывог і клопатаў, дазваляе выявіць і выказаць сябе. Гэта нагода падарыць адзін аднаму ўвагу, клопат, цяпло. Атмасфера пазітыўных эмоцый, якая, як правіла, пануе падчас такіх падзей, аб'ядноўвае людзей розных узростаў, нацыянальнасцяў, сацыяльных статусаў і ладу жыцця.

Свята – гэта падзея, якой мы заўсёды чакаем з нецярпеннем. Зусім хутка студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі ўніверсітэта будуць адзначаць найважнейшую дату – **90-годдзе з даты заснавання** нашай улюбёнай ВНУ. Псіхалагічная служба сардэчна віншуе ўсіх з гэтым выдатным святам!

І, як было сказана французскім культуролагам Марсэлем Мосам у яго «Эсэ аб дары», падарунак характарызуе таго, хто яго дорыць. Для нас, супрацоўнікаў псіхалагічнай службы, псіхалогія стала тым падарункам, які мы заўсёды рады падарыць Вам. Шчыра, творча і з радасцю!

# ПРАКТИЧЕСКИЕ ЗАНЯТИЯ,

## проводимые специалистами психологической службы БГУ

**РАЗДЕЛ 1. КОМАНДООБРАЗОВАНИЕ, РАЗВИТИЕ КОЛЛЕКТИВА, СПЛОЧЕНИЕ**

– практическое занятие «Давайте знакомиться, или Как стать дружной группой»,

– практическое занятие «Организация деловых взаимоотношений в группе, или Эффективная команда»,

– практическое занятие с элементами веревочного тренинга «Быть вместе, или Как развить в группе взаимовыручку и поддержку»,

– семинар-практикум «Творческий полет, или Как группа может превратиться в креативную команду».

**РАЗДЕЛ 2. ОРГАНИЗАЦИЯ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**

– семинар-тренинг «Учиться? Легко!», или Правила успешного студента»,

– семинар-практикум «Навыки публичных выступлений, или Как сделать свой доклад интересным и понятным»,

– семинар-практикум «Тренируем нашу память, или Как использовать свой “мегамозг”»,

– семинар-практикум «Сессия: стратегия успеха, или Как экзаменационный период сделать более организованным и успешным»,

– семинар-практикум «Сессия на «отлично», или Экзамен точно в цель»,

– семинар-практикум «Экзаменационный стресс, или Жизнь во время сессии».

**РАЗДЕЛ 3. ОРГАНИЗАЦИЯ ЖИЗНЕДЕЯТЕЛЬНОСТИ**

– семинар-тренинг «Правильная постановка целей, или Подари себе мечту»,

– семинар-практикум «На пути к успеху, или Как сделать так, чтобы весь мир тебе помогал»,

– семинар-практикум «Тайм-менеджмент, или В поисках потерянного времени»,

– семинар-практикум «Успешное трудоустройство, или Почему из множества претендентов выберут именно Вас»,

– семинар-практикум «Самоорганизация, или Как делать то, что любишь, и любить то, что делаешь».

**РАЗДЕЛ 4. МЕЖЛИЧНОСТНЫЕ ОТНОШЕНИЯ**

– семинар-практикум «Мужчина и Женщина, или Разные миры – разные психологии»,

– семинар-тренинг «Межличностные конфликты и пути их преодоления, или Как не пострадать в словесной драке»,

– семинар-тренинг «Мужчина и женщина: познать и покорить, или Рецепты счастливых отношений»,

– семинар-практикум «Общаться с удовольствием, или Как быть в гармонии с окружающими»,

– тренинговое занятие «Мы выбираем, нас выбирают, или Несколько вопросов о любви».

**РАЗДЕЛ 5. АДАПТАЦИЯ**

– практическое занятие по профессиональной адаптации студентов 1 курса «Моя профессия, или Как стать успешным специалистом»,

– практическое занятие для иностранных студентов «Я в Беларуси, или Как адаптироваться в новой стране»,

– практическое занятие для иностранных студентов «Межкультурное взаимодействие, или Как представителям разных народов жить в мире»,

– деловая игра «Мы – группа, или Как создать и сохранить в группе хорошую атмосферу».

**РАЗДЕЛ 6. САМОПОЗНАНИЕ, САМОРАЗВИТИЕ, САМОВОСПИТАНИЕ**

– игра-тренинг «Внутриличностный конфликт, или Эффективные техники ведения переговоров с самим собой»,

– семинар-тренинг «Искусство управлять собой, или Как сделать свою жизнь более яркой и интересной»,

– семинар-практикум «Самопознание, или Грани мужественности и женственности»,

– семинар-тренинг «Самовоспитание, или Вакцина против лени».

**РАЗДЕЛ 7. АКТУАЛЬНАЯ ТЕМА**

– семинар-практикум «Правда про ложь, или Как понять, что Вас обманывают»,

– семинар-практикум «Имидж специалиста, или Последние тенденции моды в деловой сфере»,

– семинар-практикум «Физиогномика, или Лицо – зеркало души. Заглянем?»,

– семинар-практикум «Слухи и сплетни, или Почему «пустая» информации распространяется в тысячу раз быстрее, чем очень нужная и важная»,

– тренинговое занятие «STOPmanipulation, или Как не купить слона, даже если очень хочется»,

– семинар-практикум «Психологический смысл подарка, или Расшифровка тайных посланий, заключенных в подарке»,

– тренинговое занятие «Семейные ценности, или Какие они – идеальные супруги»,

– тренинговое занятие «Невербальная коммуникация, или О чем рассказывают жесты»,

– семинар-практикум «Говорящая мимика, или Как по выражению лица определить настроение человека».

**Если Вы – куратор, староста группы или просто инициативный студент,** Вы можете выбрать тему, организовать на факультете группу (определить дату и время, заказать аудиторию), а специалисты-психологи всегда готовы провести занятия. **По всем вопросам обращайтесь по телефонам: (017) 328-60-37, 278-13-27, 259-74-93.**